**Miejsce na naklejkę z kodem szkoły**

*dysleksja* ☐

MOB-P1A1P-062

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

**Arkusz I**

## POZIOM PODSTAWOWY

**Czas pracy 170 minut**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Rozwiązania zadań zamieść w miejscu na to przeznaczonym.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
6. Możesz korzystać ze słowników językowych.
7. Wypełnij tę część karty odpowiedzi, którą koduje zdający. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem ◙ i zaznacz właściwe.

**Życzymy powodzenia!**

**ARKUSZ I**

**MAJ ROK 2006**

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **70 punktów**

*21 za część 1*
*49 za część 2*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

## Część I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Святланы Кошур і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.**

Святлана Кошур

***Славуты майстар фатаграфіі вяртаецца ў свой Асташын, або Дзе нарадзіўся Ян Булгак?***
(скарочана)

1. Імя аднаго з першых класікаў мастацкага фотаздымка Яна Булгака становіцца ўсё больш вядомым у Беларусі. Артыкулы пра яго змешчаны ў нашых энцыклапедычных выданнях. Да 125-годдзя з дня нараджэння польскага і беларускага фотамайстра, краязнаўца і этнографа ў шэрагу беларускіх перыядычных выданняў з'явіліся матэрыялы, якія расказвалі пра яго жыццёвы і творчы шлях. (...)
2. Месцам нараджэння Яна Булгака ва ўсіх беларускіх друкаваных крыніцах называецца вёска Асташын Навагрудскага павета. (...) Каб канчаткова высветліць месца нараджэння Яна Булгака звернемся да (...) адной кнігі, якая (...) захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі. Гэта выданне Мінскага губернскага статыстычнага камітэта "Спіс землеўладальнікаў Мінскай губерні за 1876 год". Падкрэслю, што гэта якраз год нараджэння Яна Булгака. Пад № 248 у кнізе значыцца прозвішча ўладальніка маёнтка Асташын Навагрудскага павета Булгака Валерыяна Іванавіча (гэта бацька Яна Булгака). Указваецца таксама, што ён атрымаў гэты маёнтак у спадчыну ў 1865 годзе, што валодае 248 дзесяцінамі зямлі і сам займаецца гаспадаркай. Гэта значыць, што ў 1876 годзе бацька Яна Булгака жыў у сваім маёнтку Асташын Цырынскай воласці, і што менавіта ў гэтым маёнтку ў яго нарадзіўся сын Ян. (...)
3. Прасочым жыццёвы шлях нашага славутага земляка, аўтара выдатных узораў мастацкага фотаздымка. Пасля заканчэння Віленскай класічнай гімназіі ў 1897 г. Ян Булгак паступіў на філасофскі факультэт Ягелонскага (Кракаўскага) універсітэта, які пакінуў праз некаторы час з-за фінансавых цяжкасцей. Пасяліўся ў невялікім маёнтку Перасека, што дастаўся яму ў спадчыну ад маці. Менавіта ў гэты час і адбылося першае знаёмства нашага земляка з фатаграфіяй, якое пазней перарасло ў галоўную справу яго жыцця. Спачатку гэта была спроба дапамагчы жонцы Ганне, якая атрымала фотаапарат у падарунак, зрабіць першыя фотаздымкі, затым – сустрэча ў Чамброве са стрыечным братам Каралем Карповічам, які захапляўся фатаграфіяй і нават праілюстраваў выдатнымі фотаздымкамі свае публікацыі аб прыродзе Навагрудчыны.
4. Неўзабаве фотасправа настолькі захапіла Яна Булгака, што ён стварыў у сваім доме фоталабараторыю, а каб лепш спазнаць сакрэты гэтага рамяства, пачаў перапіску з вядомымі ў той час у Еўропе майстрамі. Сур'ёзна ж займацца мастацкай фатаграфіяй наш зямляк пачаў пад уплывам ураджэнца Валожыншчыны жывапісца Фердынанда Рушчыца, з якім сустрэўся ў Вільні ў 1910 годзе.
5. Потым была паездка ў Дрэздэн, дзе Ян Булгак некалькі месяцаў спасцігаў сакрэты ў нямецкіх майстроў, а вярнуўшыся ў Вільню, у 1912 годзе адкрыў сваю ўласную фотамайстэрню.
6. Яшчэ да гэтай падзеі ён паспеў зрабіць некалькі соцень фотаздымкаў у ваколіцах Навагрудка і іншых мясцінах. Пазней выдаў іх у шасцітомным альбоме пад назвай "Літва ў фатаграфіях Яна Булгака". На гэтых здымках знайшлі адлюстраванне

памятныя мясціны Беларусі – Навагрудак, Мір, Свіцязь, Нясвіж, Крэва, маляўнічыя пейзажы, сядзібы і іх інтэр’еры, у тым ліку дом Булгакаў у маёнтку Асташын. Да 1919 года Ян Булгак зрабіў шмат фотаздымкаў найбольш цікавых будынкаў у Вільні. Гэтыя работы майстра захаваліся, яны знаходзяцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы.

7. На працягу 20 гадоў, з 1919 да 1939, Ян Булгак быў кіраўніком лабараторыі мастацкай фатаграфіі пры Віленскім універсітэце. Шмат разоў ён падарожнічаў па мясцінах з цікавым гістарычным мінулым. На Навагрудчыне ён звычайна спыняўся ў сваіх сваякоў у Чамброве. Гэта дзякуючы яго захапленню, мы сёння можам убачыць, як выглядалі сядзібы ў Райцы, Мірацічах, Варончы, Туганавічах, Чамброве, рынкі ў Навагрудку і Нясвіжы, паплавы над рэкамі Сэрвач і Нёман, а таксама касцёлы, цэрквы, сінагогі і інш.
8. Майстар здолеў зацікавіць фотасправай свайго сына Янку, які стаў яго заўзятым памочнікам. У віленскай майстэрні Яна Булгака была створана вялікая калекцыя фотаздымкаў (некалькі дзесяткаў тысяч), якія друкаваліся ў розных этнаграфічных выданнях і часопісах, сярод іх – працы “Бабулька-беларуска з маёнтка Перасека пад Мінскам”, “Экскурсія на Свіцязь”, “Беларус з-пад Клецка”, “Беларуска з-пад Клецка ў народным строі з самаробнага сукна”, “Жабракі-беларусы пад Мінскам”.
9. Ян Булгак быў не толькі майстрам мастацкай фатаграфіі, але і заснавальнікам, старшынёй Віленскага і Польскага фотаклубаў, пазней – старшынёй Саюза польскіх мастакоў-фатографаў, а таксама тэарэтыкам “фатаграфікі” (так з лёгкай рукі маэстра пачалі называць мастацкую фатаграфію).
10. Свой погляд на фатаграфію як від мастацтва Ян Булгак выказаў у кнігах “Фатаграфіка: Нарыс мастацкай фатаграфіі” (1931), “Тэхніка брому” (1933), “Эстэтыка святла: Асновы фатаграфікі” (1936), “Айчынная фатаграфія” (1951). Серыю кніг пад назвай “Вандроўкі фатографа”, якая выходзіла ў 1931 – 1936 гадах, наш зямляк назваў “аповесцямі ў слове і вобразе”. Тут можна знайсці не толькі звесткі пра майстэрства фатаграфіі, але і разважанні аўтара, захопленага прыгажосцю мясцін, якія яму давялося наведаць. А яшчэ раней, у 1919 годзе, Ян Булгак выдаў у Вільні сваю паэму “Мая зямля”.
11. Фотаработы майстра неаднаразова адзначаліся залатымі і сярэбранымі медалямі на шматлікіх выставах. На жаль, вялікая калекцыя фотаздымкаў Яна Булгака загінула ў час пажару ў 1944 годзе пры вызваленні Вільні. Згарэлі кватэра і фотамайстэрня, а разам з імі – архіў, бібліятэка, рукапісы твораў.
12. Пасля вайны наш зямляк жыў у Варшаве, дзе, вандруючы па краіне, разам з сынам працягваў галоўную справу свайго жыцця, у выніку чаго за пяць апошніх гадоў, адмераных яму лёсам, стварыў каля 8 тысяч фотаздымкаў. Смерць перапыніла яго творчую дзейнасць 4 лютага 1950 года.
13. Сёння спадчына Яна Булгака зберагаецца ў архівах і бібліятэках Літвы, Польшчы, Расіі і Беларусі. Фотамайстар з Асташына пакінуў усім нам вялікі скарб – цудоўныя фотаздымкі, якія даюць магчымасць адчуць подых гісторыі, ажыўляюць у нашых душах пачуццё прыналежнасці і дачынення да мінулага. Таму вельмі хочацца, каб у хуткім часе на радзіме Яна Булгака ў вёсцы Асташын Карэліцкага раёна быў устаноўлены памятны знак як даніна павагі нашаму славутаму земляку.

“Голас Радзімы”, № 1-2, 13.01.2005 г., с. 9

## Заданні да тэксту

Прачытай уважліва тэкст Святланы Кошур і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.

**Заданне 1** ***(2 пункты)***
Святлана Кошур прысвяціла свой артыкул вядомаму пачынальніку мастацкай фатаграфіі Яну Булгаку. Напішы, чаму яго постаць павінна быць блізкай беларусам.

а) Ян Булгак нарадзіўся на беларускай зямлі
б) фатаграфаваў беларусаў, беларускія помнікі архітэктуры і краявіды

**Заданне 2** ***(3 пункты)***
Прадстаў у пунктах асноўныя факты з жыцця Яна Булгака:

**а)** да I сусветнай вайны

– нарадзіўся ў 1876 годзе ў вёсцы Асташын;
– жыў у маёнтку Перасека (спадчына па маці), дзе пачаў цікавіцца і аматарска займацца фатаграфіяй;
– вучыўся ў Віленскай класічнай гімназіі і на філасофскім факультэце Ягелонскага універсітэта;
– з 1910 г., пад уплывам Ф. Рушчыца, пачаў сур'ёзна займацца фатаграфіяй; некалькі месяцаў вучыўся фатаграфавання ў Дрэзне, у нямецкіх майстроў;
– у 1912 г. паўстала ў Вільні ўласная фотамайстэрня Яна Булгака;

**б)** у міжваенны перыяд

– у гг. 1919 – 1939 жыў у Вільні; быў кіраўніком лабараторыі мастацкай фатаграфіі, існуючай пры Віленскім універсітэце;
– быў заснавальнікам і старшынёй Віленскага і Польскага фотаклубаў;
– быў старшынёй Саюза польскіх мастакоў-фатографаў

**в)** пасля II сусветнай вайны

– жыў у Варшаве і надалей заўмаўся фатаграфіяй
– памёр 4 лютага 1950 г.

**Заданне 3** ***(1 пункт)***
На аснове 3 і 4 абзацаў пералічы 3 фактары, якія паўплывалі ў жыцці Яна Булгака на выбар прафесіі фатографа.

**а)** спроба дапамагчы жонцы зрабіць першыя фотаздымкі фотаапаратам, які яна атрымала ў падарунку
**б)** сустрэча са стрыечным братам Каралем Карповічам, захопленым фатаграфіяй
**в)** сустрэча з жывапісцам Фердынандам Рушчыцам у Вільні ў 1910 г.

**Заданне 4** ***(2 пункты)***
На аснове 3 і 13 абзацаў адкажы, як разумееш фразеалагізмы:

а) “жыццёвы і творчы шлях” – жыццё і творчасць
б) “подых гісторыі” – напамінанне пра гісторыю, яе прысутнасць

**Заданне 5** ***(2 пункты)***
На аснове абзацаў 6, 7 і 8 напішы, у чым заключаецца значэнне Яна Булгака для беларускай культуры.

а) дзякуючы яго фатаграфіям можам пабачыць, як калісьці выглядалі славутыя беларускія гарады, напр. Навагрудак ці Мір
б) захаваў на здымках помнікі архітэктуры, каб памяць аб іх не загінула
в) фотаздымкі з ваколіц розных мясцін, выдадзеныя асобным альбомам
г) фатаграфаваў тое, што з’яўлялася характэрным для беларускіх зямель

**Заданне 6** ***(2 пункты)***
На аснове 10 абзаца высветлі значэнне паняцця “аповесці ў слове і вобразе” і напішы да чаго адносіцца гэтая назва.

Назва адносіцца да серыі кніг «Вандроўкі фатографа». Апрача звестак пра майстэрства фатаграфіі, можна там было прачытаць разважанні аўтара.

**Заданне 7** ***(2 пункты)***
У якіх месцах можна знайсці працы фотамастака і ў якой форме яны даступныя? (абзацы 6, 8, 13)

а) даступныя ў форме альбомаў, этнаграфічных выданняў, часопісаў
б) працы Булгака можна знайсці ў архівах і бібліятэках Літвы, Расіі, Польшчы і Беларусі

**Заданне 8** ***(1 пункт)***
Пералічы, прынамсі, 3 гістарычныя мясціны, якія фатаграфаваў Ян Булгак.

Вільня, Навагрудак, Мір, Нясвіж, Крэва

**Заданне 9** ***(1 пункт)***
Сваімі словамі растлумач, як разумееш паняцце “зямляк”, якім аўтар называе Яна Булгака.

«Зямляк» гэта той, хто паходзіць з гэтых самых зямель, што аўтар, напр. з гэтай самай мясцовасці.

**Заданне 10** ***(1 пункт)***
Адкажы, пра якое ўшанаванне памяці Яна Булгака ў яго роднай вёсцы марыць Святлана Кошур (13 абзац)

Хоча, каб у вёсцы Асташын у хуткім часе быў устаноўлены памятны знак як даніна павагі славутаму беларусу.

**Заданне 11** ***(1 пункт)***
Падумай і адкажы, якую функцыю поўніць гэты артыкул. Выбяры правільны адказ.

а) экспрэсіўная
<u>б) інфармацыйная</u>
в) прапагандысцкая

**Заданне 12** ***(2 пункты)***
На аснове тэксту напішы ў двух сказах пра заслугі Яна Булгака для развіцця фатаграфікі (абзацы 7, 9, 10).

- Сваім захапленнем – фатаграфікай, хацеў зацікавіць таксама іншых, менавіта таму быў кіраўніком лабараторыі мастацкай фатаграфіі, якая існавала пры Віленскім універсітэце, заснавальнікам і старшынёй Віленскага і Польскага фотаклубаў і старшынёй Саюза польскіх мастакоў-фатографаў.
- Быў тэарэтыкам «фатаграфікі», як дзякуючы яму пачалі называць мастацкую фатаграфію і стварыў тэарэтычныя яе асновы.

**Заданне 13** ***(1 пункт)***
Назаві галоўную думку артыкула.

Памяць аб славутых людзях ажыўляе ў беларусаў пачуццё гонару.

**Część II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu.**
**W tej części znajdują się dwa tematy. Wybierz jeden i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl**

Тэма 1:

**Зубр як “цар пушчы” і сучасная цывілізацыя. Прадстаў адносіны чалавек – зубр на аснове фрагмента прозы Уладзіміра Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”.**

Уладзімір Караткевіч

***Зямля пад белымі крыламі***

[...] Беларусь пастунова бяднела звярамі. Зубр, які сустракаўся ў Палессі і на поўдні Прыдняпроўя яшчэ ў XVIII ст., быў выбіты і збярогся толькі ў Белавежы. [...]

Пушча аглухла ад стрэлаў. Хрыпелі праз кроў дзікі, біліся ў сутаргах алені і рахманыя даніэлі, цяжка валіліся на зямлю і моўчкі паміралі зубры (зубр заўсёды памірае моўчкі, не прыніжае сябе нават у смяротны час, трымаецца гонару). [...]

У 1921 годзе нехта Барталамей Шпакоўскі забіў апошняга зубра, у 1923 г. на парыжскім міжнародным кангрэсе аховы прыроды выявілі, што на зямлі засталося 52 зубры, прададзеныя ў свой час з Белавежы ў заапаркі і паркі заходніх арыстакратаў і магнатаў прамысловасці. Некаторых з іх купілі і ў 1929 г. зноў завезлі на радзіму, адкуль калісьці прадалі, у Пушчу. Зараз на беларускай палове запаведніка [...] налічваецца семдзесят (па звестках 1970 г.) зуброў, ды шмат яшчэ перавезлі ў некаторыя другія запаведнікі краіны і за мяжу. Каб разводзіліся. Каб не рызыкаваць “адзіным месцам абітання” каштоўнай жывёлы.

Белавежскія зубры, якія нарадзіліся ў Польшчы, носяць імёны, якія пачынаюцца на літару “п”. Тыя, што нарадзіліся на Беларусі, маюць імёны, першая літара якіх – “б” (напрыклад, Борус).

[...] Зубр дужа цікавы звер. Засведчаны, напрыклад, факт з пачатку XIX ст. Нейкі шляхціц вяртаўся дужа п’яны з гулянкі пушчанскай дарогай і, вядома, заснуў у санках, зашыўшыся ў сена. Зубр падышоў, асцярожна паддзеў чалавека рагамі і выкаціў у снег. У таго адразу і хмель прапаў. Коні не збаяліся зубра. Як ступалі дагэтуль, так ступалі і далей. Зубр ішоў за санкамі і еў сена. А шляхціц валокся за ім па снезе і гарлаў:

- Жываціна ты подлая! Карова ты халерная! Аддай, кажу! Апсік (як на ката)! Каб цябе самога так выкаціла, як ты мяне выкаціў...

Зубр не звяртаючы ўвагі, “уклаў” (з’еў) усё сена і пайшоў у лес.

Раскажу яшчэ некалькі выпадкаў, сведкам якіх быў я сам.

У пушчы зуброў трымаюць па-рознаму. Ля галоўнага будынка (там гасцініца, рэстаран, музей) ёсць нешта накшталт заапарка: вялікія вальеры, у якіх звяры жывуць у максімальна прыбліжаных да натуральнага свайго жыцця ўмовах (калі яны вытапчуць траву, агароджа пераносіцца на новае месца, пакуль старое не зарасце). Тут некалькі зуброў, дзікі, алені, лані і іншыя жывёлы пушчы. Гэта каб людзі маглі паглядзець жывёл, не ад’язджаючы, не забіраючыся ў глыб пушчы. Каб не калясілі, не палохалі звяроў, каб сэрца пушчы засталося нечапаным.

Другі спосаб утрымання зуброў – на вялізных агароджаных участках лесу. Так, у прыватнасці, трымаюць матак з маленькімі лабастымі цяляткамі, якія так непаразумела глядзяць на цябе, калі ты падыходзіш.

І, урэшце, значная частка зуброў жыве проста на волі. Едзеш і раптам бачыш сярод зялёнай-зялёнай паляны бурую вялізную тушу. Метры тры даўжынёю, высачэнную, вагою да тоны. Магутны, цяжкі, як гара, горб. Рагастая, лабастая і барадатая галава апушчана. Пасвіцца.

[...] У адзін з першых прыездаў у Пушчу я і мае сябры – мясцовы настаўнік і пісьменнік з Брэста – дужа хацелі ўбачыць зубра на волі. “Дзе мы яго знойдзем? Ходзіць недзе, - сказалі нам. – Куды захацеў, туды і пайшоў. Шукайце. Пашанцуе, то ўбачыце. А лепей ідзіце туды. Там тарпаны!”

Рабіць няма чаго, пайшлі ў нетры глядзець тарпанаў. Маленькія мышастыя конікі з раменьчыкам на хрыбціне. Ідзём уздоўж агароджы вялізнага загона. На дарозе – елка-вываранець. Агромністая. Карані з зямлёю стаяць блінам вышынёю паверхі на два. Падыходзяць тарпаны. Нас дзеліць вузкая агароджа. Ідзём да іх, мінаем ёлку, голасна клічам, смяёмся. І тут я, азірнуўшыся, аж пахаладзеў. За спіною (з-за ёлкі не бачылі), метрах у чатырох, мілая сямейка: баця, здаравенны, мама, крыху меншая, і цялятка. Што рабіць? Каб адзін зубр, то хаця вакол дрэва можна было бегаць. А так двох, з двух бакоў дастануць. Скакаць да тарпанаў? Невядома, як яны да гэтага паставяцца. Ды й што зубру такая лядашная загародка?.. На шчасце, звяры не звярнулі на нас увагі. Тады я асмелеў, выйшаў з-за елкі, і сябар сфатаграфаваў мяне і іх. Тыя толькі пакасіліся, аддаляючыся ў пушчу.

Пазней, калі мне давялося памногу бываць там, я заўсёды браў з сабой некалькі газет. Ідзеш, а ён стаіць на паляне, на самай дарозе, і ў вус не дзьме. Адчувае сябе гаспадаром. Адчувае, што галоўны тут ён, а не ты. Запаліш газету і ідзеш, махаеш. Тады ён неахвотна – “ат, не варта звязвацца з рознаю дробяззю” – адыходзіць, дае дарогу...

Да аўтамашыны зубр ставіцца памяркоўна, але матацыклаў цяпець не можа, яны яго нервуюць. Некалькі разоў зубр так гнаўся за матацыклістамі, што няшчасным ледзь удавалася ўцячы.

Вельмі любяць чыстую ваду. Аднойчы студэнтка-практыкантка ўмывалася ля студні, з якой пояць зуброў (каб не хадзілі далёка на вадапой), паклала на зруб мыла, а яно ўзяла і ўпала ўніз. Ужо і мыла клятае дасталі, і ваду некалькі разоў да дна вычарпалі, а зубры ўсё адно некалькі тыдняў не пілі з гэтай студні.

Значэнне загарадак вакол вялікіх загонаў, дзе ходзіць частка зуброў, чыста сімвалічнае. Зубр лёгка разбівае лбом іхнія бярвенні дыяметрам у 15-20 см. Егер казаў мне: “Як кінецца на агароджу – не ўцякайце далей. Усё адно не ўцячэце”.

І вось які выпадак здарыўся з намі, калі мы здымалі там фільм аб пушчы. Ці то зубра раз’ятрыў строкат “Конваса” ці проста мы яму абрыдлі – кішыць вакол нейкая драбяза! – але ён раптам з цалкам спакойнага стану адразу перайшоў у атаку. Мы, ясна ж, кінуліся хто куды, урассыпную. Добра, што гэта быў проста дэмарш: бык хацеў папалохаць, а не дагнаць. Але рэзультат атрымаўся такі, што мы пасля не маглі апамятацца ад здзіўлення.

Я паспеў скочыць праз агароджу, асістэнт аператара, уцякаючы, наляцеў на сук і выбіў сабе пярэдні зуб. А аператара доўга не маглі знайсці, і толькі потым, як з неба, даляцеў да нас ягоны голас.

У. Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* [w:] В. Сянкевіч, Я. Грырарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.* WSiP, Warszawa 2001, s. 262, 264-266

Temat 1.

Уладзімір Караткевіч у сваім эсэ пад загалоўкам «Зямля пад белымі крыламі» закрануў, між іншым, вельмі актуальную ў цяперашні час тэму аховы зуброў і ўплыў на іх сучаснай цывілізацыі.

Зубры жывуць у Белавежскай пушчы спакон вякоў. Калі паглядзім на іхнюю гісторыю, яна акажацца даволі цяжкай і складанай, таму што зубры заўсёды былі аб’ектам зацікаўлення паляўнічых. Зуброў яшчэ ў XVIII стагоддзі можна было сустрэць у Палессі і на поўдні Прыдняпроўя. У цяперашні час яны жывуць толькі і выключна ў лясах Белавежы. Белавежская пушча, якая займае частку тэрыторыі Польшчы і Беларусі, з’яўляецца запаведнікам. Гэта значыць, што паляванні там цяпер забароненыя. Калі пушча яшчэ не была запаведнікам і на звяроў можна было паляваць без абмежаванняў, чалавек давёў да смерці апошняга зубра, які там жыў. Згінуў ён у 1921 годзе з рукі Барталамея Шпакоўскага.

Два гады пазней, на парыжскім міжнародным кангрэсе аховы прыроды было сказана, што ва ўсім свеце ўсяго толькі 52 зубры. Тады людзі рашылі павялічыць колькасць зуброў не толькі ў Белавежскай пушчы, але і ў іншых запаведніках. Гэта з’яўляецца доказам, што зубр калісьці лічыўся і цяпер лічыцца вельмі каштоўнай жывёлай. Зубры, народжаныя на тэрыторыі Польшчы, носяць імёны, якія пачынаюцца з літары «п», а імёны цялятак з тэрыторыі Беларусі пачынаюцца з літары «б».

Зубр гэта «цар Белавежскай пушчы», яе гаспадар і ўладар, галоўны жыхар і найбольшае багацце. Ён з’яўляецца сімвалам мужнасці і гонару. Зубр вельмі дужы і магутны звер. На першы погляд можа здавацца, што ён нязграбны, але гэта ж няпраўда. Ён умее сапраўды хутка бегаць. Зубр ніколі не нападае першы. Ён не пакрыўдзіць, калі нехта або нешта яго не раззлуе. «Да аўтамашыны зубр ставіцца памяркоўна, але матацыклаў цярпець не можа, яны яго нервуюць». Адначасова гэта вельмі надзейны і мудры звер, які ў патрэбе дапаможа іншай жывёле, а нават чалавеку. Абавязкова трэба заўважыць, што зубр гэта ганаровы звер – ён заўсёды памірае моўчкі, яго смерць з’яўляецца ціхай і непрыніжанай.

У сучасны перыяд адносіны чалавека да зуброў намнога змяніліся. Некалі папулярнымі былі паляванні на зуброў. Сёння людзі назіраюць за іх цікавым жыццём, робяць здымкі, здымаюць фільмы, пішуць навуковыя даследаванні. Зацікаўленне чалавека жыццём зуброў мяшаецца адначасова са страхам, які ў людзей выклікае сам выгляд гэтых звяроў.

У запаведніку зуброў трымаецца па-рознаму. Першы спосаб гэта стварэнне ўмоваў жыцця максімальна прыбліжаных да натуральных. Створана нешта накшталт заапарка: вялікі абшар, дзе супольна жывуць між іншым зубры, дзікі, алені, лані. Гэта дае магчымасць турыстам

паглядзець многія віды жывёл у адным месцы і адначасова сэрца пушчы пакінуць нечапаным.

Матак з маленькімі цяляткамі трымаюць ужо па-іншаму, «на вялізных агароджаных участках лесу», каб яны мелі як найбольш спакою і цішыні.

Трэці спосаб гэта проста воля, якая дае магчымасць непасрэднага кантакту з «царом пушчы». «Едзеш і раптам бачыш сярод зялёнай-зялёнай паляны бурую вялізную тушу. Метры тры даўжынёю, высачэнную, вагою да тоны. Магутны, цяжкі, як гара, горб. Рагастая, лабастая і барадатая галава апушчана.» Ён пасвіцца на паляне, часта вельмі блізка машын, якія праязджаюць, і тады здаецца яшчэ большым і магутнейшым. «Стаіць на паляне, на самай дарозе, і ў вус не дзьме. Адчувае сябе гаспадаром. Адчувае, што галоўны тут ён, а не ты.»

Адносіны чалавек – зубр у эсэ Уладзіміра Караткевіча паказаны на аснове выпадкаў з жыцця, што падкрэслівае прысутнасць бытавога кантэксту ў гэтай прозе. Караткевіч звяртае асаблівую ўвагу на падрабязнасці апісання паасобных здарэнняў, якія ён найчасцей браў са свайго жыцця, напрыклад сустрэча аўтара і яго сяброў з сям’ёй зуброў. Караткевіч прыводзіць таксама засведчаны выпадак з XIX стагоддзя, калі зубр выкаціў у снег п’янага шляхціца, які заснуў у санках. Усе здарэнні аўтар прадстаўляе ў апісальны спосаб. У апісаннях, як мастацкія сродкі, выкарыстоўвае антрапамарфізм і метафару. Дзякуючы выкарыстанню адпаведных мастацкіх сродкаў, нам можа здавацца, што мы таксама з’яўляемся ўдзельнікамі ўсіх апісаных здарэнняў.

Уладзімір Караткевіч у эсэ «Зямля пад белымі крыламі», на аснове прыведзеных прыкладаў, паказаў, як на працягу гісторыі змяняліся лёсы зубра, які сёння з’яўляецца «царом Белавежскай пушчы».

Кожнага дня ва ўсім свеце назаўсёды гіне некалькі відаў жывёл і раслін. Каб зубр – сімвал Беларусі і Беласточчыны, праіснаваў, трэба яго ахоўваць. Таму магутныя зубры жывуць цяпер у запаведніках, не, як калісьці, на волі. Быў такі момант у гісторыі, калі людзям амаль удалося назаўсёды знішчыць гэты вельмі каштоўны від жывёлы. На шчасце, чалавек у пару апамятаўся і ўдалося яму развесці зуброў нанава. Гэта даказвае, як важнай з’яўляецца ахова гэтай жывёліны і стварэнне ёй адпаведных умоваў жыцця і размножвання. Ахова прыроды заўсёды павінна быць для чалавека самай важнай.

Тэма 2: **Патрыятычныя і гістарычныя матывы ў вершы Максіма Багдановіча “Пагоня”. Ахарактарызуй гімнічнасць твора.**

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, -
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, -
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі – гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Бійце ў сэрцы іх – бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна !
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач. Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

1916

М. Багдановіч, *Пагоня* [w:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.* WSiP, Warszawa 2001, s. 121

Temat 2.

Патрыятычная тэма – неадлучны элемент беларускай літаратуры ад пачатку яе існавання. Яна непасрэдна звязана з гістарычнымі падзеямі, якія адбываліся на беларускіх землях. Адны аўтары ў сваёй творчасці адклікваліся да вялікіх і славутых гістарычных падзей, якія мелі месца на

тэрыторыі Беларусі, іншыя канцэнтравалі сваю ўвагу на часах і падзеях сучасных ім.

Палітычная тэма займае вельмі важнае месца ў творчасці Максіма Багдановіча. Ён з'яўляецца сапраўдным патрыётам сваёй айчыны – Беларусі, нягледзячы на гэта, што многа гадоў са свайго кароткага жыцця, правёў па-за межамі радзімы. Доказам яго вялікай любові да Беларусі і адданасці ёй з'яўляецца верш «Пагоня».

Задума напісання верша з'явілася пад уплывам уражанняў Багдановіча пасля прабывання ў Вільні. Штуршком была выява Пагоні, змешчаная на Вострай Браме. Яна зрабіла вялікае ўражанне на Багдановічу, аб чым сведчаць наступныя словы:

«Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.»

Верш «Пагоня» прысвечаны старажытнаму гербу Вялікага княства Літоўскага, які быў сімвалам адзінства беларускай нацыі. Пагоня ўяўляе сабою выяву размешчанага на чырвоным фоне конніка на белым кані, скіраванага ў левы бок. Коннік у правай руцэ трымае высока падняты меч, а ў левай – шчыт, на якім ёсць знак шасціканцовага крыжа.

Словы верша аказаліся вельмі важнымі для беларусаў, з увагі на закранутую у ім тэму вялікай і сапраўднай любові да сваёй краіны. Верш стаў патрыятычным гімнам Беларусі. Да яго была напісана музыка. Верш «Пагоня» стаў песняй, якая выконваецца, як урачысты хвалебны гімн, у якім ушаноўваецца славутае мінулае Вялікага княства Літоўскага.

Максім Багдановіч у вельмі дынамічны спосаб апісвае сілу, хуткасць, мужнасць і геraічнасць коннікаў, якія змагаліся за свабоду сваёй Радзімы, часта плацячы за яе крывёю, а нават жыццём. Дынамізм аўтар дасягае дзякуючы выкарыстанню многіх дзеясловаў:

«Ў белай пене праносяцца коні, –
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.»

У вершы Багдановіч выкарыстоўвае рытарычныя пытанні:

«Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?»

Не чакае адказу, сам мяркуе:

«Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,

Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?»

У гэтай страфе можна заўважыць выразнае выступленне супраць здраднікаў і злачынцаў, якія адракліся ад сваёй Бацькаўшчыны, пакінулі яе, прадалі ворагу.

Лірычны герой, звяртаючыся непасрэдна да Беларусі: «Маці родная, Маці-Краіна!», просіць, каб яна спрабавала выбачыць нягодным людзям усе крыўды, каб аднак прыняла тых, якія саграшылі і здрадзілі яе. Цана, якую прыдзецца заплаціць за прабачэнне можа быць вельмі высокай, часам найвышэйшай – тады трэба ахвяраваць сваім уласным жыццём:

«Ты прабач. Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!...»

Верш Масіма Багдановіча «Пагоня», дзякуючы выкарыстанню ў ім старажытнага гербу Пагоні, нібыта злучае ўсе мінулыя эпохі з сучаснасцю. Першыя звесткі пра герб, мы знаходзім у беларуска-літоўскім летапісе каля 1270 года. Потым герб Пагоні можна было сустрэць на харунгвах у часе Грунвальдскай бітвы 1410 года.

«Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.»

Пагоня стала сімвалам і сінонімам патрыятызму, веры ў лепшую будучыню Беларусі і беларусаў. Спосаб апісання яе ў вершы даказвае вялікай пашаны славутай гісторыі Беларусі.

# BRUDNOPIS